в частности, когда тот самый ислам, выходит за рамки своего государства и распространяется в границах Европы. На сегодняшний день это является одной из самых главных и опасных для человечества проблем, ведь чаще всего совершают религиозные теракты именно выходцы из мусульманских стран, что не менее важное, за пределами своих государств.

Как мы видим, казалось бы, безобидная модернизация в самом начале своего развития общества тянет за собой куда более важные проблемы, создающие опасность человечества.

И так, подводя вывод, стоит обобщить главные религиозные проблемы в современном мире:

- секуляризация;
- фундаментализм;
- терроризм и эмиграция.

В целом, религия вполне претендует на одно из ключевых мест на международной арене, поскольку сегодня она не охватывает, как ранее, узкий спектр духовных областей; а наоборот, тесно связана с политическими, культурными реалиями современного общества.

## Список источников и литературы


1. Гараджа, В. И. Религиоведение / В. И. Гараджа. – М.: «Наука», 1995. – 351 с.
2. Эгильский, Е. Э., Матецкая, А. В. Новые религиозные движения / Е. Э. Эгильский, А. В. Матецкая. – М.: «Алгоритм» 2013. – 224 с.



УДК 271.2:272:17.022.1:005.44



**В. А. Адзіночанка**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны


# ПРАВАСЛАЎЕ І КАТАЛІЦТВА АБ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ ПЕРАД ВЫКЛІКАМ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ


*У артыкуле разглядаецца розніца адказаў праваслаўнай і каталіцкай царквы на выклік глабалізацыі. Руская праваслаўная царква яе асноўную небяспеку бачыць ў разбурэнні традыцыйнай маралі і распаўсюджванні кантоўнасцей лібералізму. Каталіцкая царква робіць націск на неабходнасць захаванняў сучасных умовах сацыяльнай справядлівасці.*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мы будзем казаць аб рэакцыі праваслаўнай і каталіцкай царквы на выклік глабалізацыі, выходзячы з нашага сучаснага становішча. Адметнай рысай Беларусі з'яўляецца яе поліканфесійнасць. На 1 студзеня 2017 года ў краіне зарэгістравана 1679 праваслаўных, 495 каталіцкіх і 1032 пратэстанцкіх суполак. Гэта абумоўлена гістарычна. Беларусь паслядоўна ўваходзіла ў склад розных дзяржаўных утварэнняў, і рэлігійная сітуацыя ў ёй кардынальна мянялася. Кажучы схематычна, на працягу значнай часткі гісторыі на нашых землях змагаліся два ўплывы: каталіцкі з Польшчы і праваслаўны з Расіі. Зараз сітуацыя змянілася перад усім адносна каталіцкай царквы, яна падкрэслівае свой усеагульны характар (ад грэч. *katholikos – сусветны*). Што тычыцца праваслаўя ў Беларусі, то арганізацыйна яно з'яўляецца часткай Рускай праваслаўнай царквы, і гэтым шмат ў чым абумоўлены яго геапалітычныя арыентацыі.

Мы выходзім з агульнапрынятага тлумачэня глабалізацыі. Яна разумеецца як працэс узмацнення ўзаемадзеяння паміж рознымі рэгіёнамі Зямлі і ўтварэння  ў перспектыве адзінай агульначалавечай цывілізацыі. Для беларускай грамадскай думкі характэрным з'яўляецца падкрэсліванне праблемнага характару гэтага працэсу. Глабалізацыя азначаецца як «узрастаючая ўзаемазалежнасць дзяржаў у галіне эканомікі, палітыкі, інфармацыі; працэсы сучаснай сацыякультурнай дынамікі, звязаныя з універсалізацыяй рынка, дамініраваннем неаліберальных форм дэмакратыі, змяненнем ролі дзяржавы і нацый, перавагай транснацыянальных праектаў у розных сферах жыцця, утварэннем аднапалярнага свету» [1, с. 48]. Большасць аўтараў лічыць неабходным падкрэсліць, што цэнтрам сучаснай глабалізацыі з'яўляюцца ЗША.

Вылучаюць наступныя віды глабалізацыі: эканамічная, палітычная і культурная. Першыя два звычайна ўспрымаюцца як аб'ектыўны працэс збліжэння паміж краінамі, непазбежнасць якога абумоўлена спецыфікай сучаснага эканамічнага і палітычнага жыцця, у прынцыпе разглядаюцца ў пазітыўным ключы і звязваюцца з прагрэсіўным развіццём грамадства. Іх маральны аспект бачыцца ў неабходнасці захавання справядлівасці і роўнапраўя ва ўзаемаадносінах паміж рознымі рэгіёнамі. Наконт жа культурнай глабалізацыі выказваюцца шматлікія асцярогі маральнага плану. Яе небяспеку бачаць перш за ўсё ва уніфікацыі і стандартызацыі жыцця. Але з боку прадстаўнікоў нееўрапейскіх культур асноўны націск пры крытыцы глабалізацыі робіцца на маральны аспект праблемы: сцвярджаецца, што яна мае сваім наступствам разбурэнне традыцыйных каштоўнасцей паводзін і тым самым маральную дэзарыентацыю і заняпад.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, культурная глабалізацыя разглядаецца як выклік, на які трэба даць адказ.

У трактоўцы глабалізацыі як выкліку, мы зыходзім з палажэння А. Тойнбі: «Выклік заахвочвае да росту. Адказам на выклік грамадства вырашае задачу, якая перад ім паўстала, чым пераводзіць сябе ў больш высокі і больш дасканалы з пункту гледжання ўскладнення структуры стан» [2, с. 119–120].

У культурнай глабалізацыі можна вылучыць два асноўныя працэсы, якія адбываюцца на розных узроўнях: па-першае, гэта збліжэнне паміж культурамі і ўзаемакарысны абмен каштоўнасцямі, па-другое, у самой сутнасці культурнай глабалізацыі змяшчаецца не толькі магчымасць, але і непазбежнасць уніфікацыі. Справа перад усім ў тым, што адбываецца навязванне акрэсленай сістэмы каштоўнасцей, сфарміраваных у межах заходнееўрапейскай культуры, што ў іншых культурах разглядаецца як праява «культурнага імперыялізму». Прычым вельмі часта фундаменту тых традыцыйных каштоўнасцей, якія абараняюцца ад разбурэння, надаецца рэлігійны характер. Такім чынам, ідзе размова аб сутыкненні схем паводзін, выпрацаваных у межах хрысціянскай культуры, з мусульманскімі, індуісцкімі, канфуцыянскімі і г. д. Для нашай краіны гэты аспект канфлікту не мае значэння, паколькі мы належым да еўрапейскай культуры, адной з крыніц якой з’яўляецца хрысціянства.

Неад’емным кампанентам культурнай глабалізацыі з’яўляецца лакалізацыя – узмацненне інтарэсу да мясцовых (нацыянальных альбо лакальных) культур. Ён складваецца стыхійна, але таксама з той ці іншай паслядоўнасцю падтрымліваецца ўрадамі розных краін. У Беларусі ў апошнія гады рэзка ўзрасла цікавасць да пабытовай нацыянальнай традыцыі: святаў, ежы, аддзення і г. д. Прычым, трэба адзначыць, што інтарэс да этнаграфічнай спадчыны Беларусі зараз дэманструецца не толькі на ўзроўні маладзёвых суполак, але і беларускіх уладаў. Пры гэтам элементы традыцыйнай культуры ўскосна звязваюцца з язычніцтвам, якое разглядаецца як элемент беларускага светапогляду. Гэтая акалічнасць таксама з’яўляецца выклікам для праваслаўя і каталіцтва.

Трэба памятаць, што ў сучаснай Беларусі адбываецца пераход ад аднаго глабалізацыйнага праекту да іншага. Гэта тычыцца і рэлігійнай сферы.

Савецкае грамадства было ідэалагізаваным. З пункту погляду афіцыйнай ідэалогіі рэлігія разглядалася ў дзвюх іпастасях: альбо як «забабоны», альбо як «форма антыкамуністычнай ідэалогіі». Лічылася, што яна паступова знікне ў працэсе пабудовы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

камуністычнага грамадства ў сусветным маштабе. Мы былі часткай гэтага глабальнага праекту.

Выхад Беларусі, як і іншых краін, якія ўмоўна называюцца «постсавецкімі», з камуністычнага глабалізацыйнага праекту прывёў да істотных змен у рэлігійнай сферы. Пачаўся працэс павелічэнння колькасці рэлігійных арганізацый. За перыяд з 1988 па 2017 г. яны ўзраслі з 765 да 3337. Аналіз паказвае, што гэты працэс будзе працягвацца і далей.

Адбываецца забеспячэнне свабоды сумлення і роўнасці рэлігій. У Канстытуцыі Беларусі запісана: «Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам» [3, с. 8]. Ва ўмовах традыцыйна поліканфесійнай Беларусі ажыццяўленне гэтай нормы патрабуе дадатковых намаганняў як ад дзяржавы, так і ад рэлігійных арганізацый. Паступовае наладжванне нармальнага і бесканфліктнага рэлігійнага жыцця ў Беларусі з'яўляецца часткай працэсу ўваходжання яе ў еўрапейскую культурную і рэлігійную прастору і тым самым суаднясення з сусветнымі глабалізацыйнымі працэсамі.

На наш погляд, зараз актуальным ў Беларусі з'яўляецца выпрацоўка свайго бачання і асэнсавання глабалізацыі. Вельмі часта яна ўспрымаецца з пункту погляду Расіі. У апошні час у гэтай краіне ўсё больш узмацняецца тэндэнцыя, накіраваная на падкрэсліванне сваёй цывілізацыйнай спецыфікі і адрознення ад Еўропы. Як правіла, пад гэта падводзіцца рэлігійны фундамент. Лічыцца, што духоўнай асновай рускай культуры з'яўляецца праваслаўе, і тым самым яна адрозніваецца ад каталіцка-пратэстанцкай культуры Еўропы. Тым больш, што апошняя, як сцвярджаецца, моцна секулярызавана. Таму размова ў прынцыпе ідзе аб супрацьстаянні праваслаўнай Расіі працэсам глабальнай секулярызацыі, якія ідуць з Захаду.

Найбольш выразна гэта аформілася ў ідэі так званага «рускага свету», адным з вядомых апалагетаў якой з'яўляецца Патрыярх Кірыл: «Рускі свет – гэта не свет Расійскай Федэрацыі, гэта не свет Расійскай імперыі. Рускі свет – ад кіеўскай купелі хрышчэння. Рускі свет – гэта і ёсць асаблівая цывілізацыя, да якой належаць людзі, якія сёння сябе называюць рознымі імёнамі – і рускія, і ўкраінцы, і беларусы» [4].

Разгляд глабалізацыі як выкліку ў Рускай праваслаўнай царкве абумоўлены сучаснай сітуацыяй у Расіі. Пасля распаду Савецкага Саюза ў краіне востра ўстала праблема пошуку свайго месца ў свеце і захавання спецыфікі расійскай культуры. Таму асноўная ўвага ў Рускай праваслаўнай царкве надаецца выкліку культурнай глабалізацыі. Сцвярджаецца, што ў цяперашні час на пярэдні план выйшла супрацьстаянне паміж заходняй цывілізацыяй і астатнім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

светам: «На змену суперніцтву ідэалогій ідзе новае суперніцтва, якое цяжка вылячыць: глабалізм і ўніверсалізм як выразу прынцыпу ўсеагульнага супраць кансерватызму і традыцыяналізму, як выраза прынцыпу адзінкавага і асобнага» [5].

У сувязі з гэтым варта падкрэсліць celebrate рознае месца ў працэсе глабалізацыі каталіцкай і Рускай праваслаўнай царквы. Пачатак выхаду за межы Еўропы і распаўсюд па ўсім свеце каталіцтва звязана з Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі XV–XVII стст. Следам за мараплаўцамі і канкістадорамі прыходзілі місіянеры. Распаўсюджванне рускага праваслаўя ажыццяўлялася разам з засваеннем шырокіх тэрыторый Сібіры і Далёкага Усходу. Але таксама варта памятаць і пра заходні вектар руху. На нашых землях распаўсюджванне праваслаўя было непасрэдна звязана з палітычнымі інтарэсамі Расіі. Асабліва яскрава дадзеная акалічнасць выявілася ў XIX ст.

Гэта адбілася і на трактоўцы глабалізацыі з боку праваслаўя і каталіцтва. Абедзве царквы ўспрымаюць яе як выклік, на які неабходна даць адказ. У каталіцкай царквы адзначаецца: «Радыкальныя пытанні, якія ад самага пачатку спадарожнічаюць чалавеку на яго шляху, набываюць у наш час яшчэ большую значнасць з прычыны шматлікіх выклікаў, навізны сітуацый, важных рашэнняў, якія павінны прымаць сучасныя пакаленні» [6, с. 29]. Адным з такіх выклікаў з'яўляецца глабалізацыя, «якая мае не толькі эканамічнае, але больш шырокае і глыбокае значэнне, паколькі ў гісторыі разам з ёй распачалася новая эпоха, цесна звязаная з лёсам чалавецтва» [6, с. 29].

Праваслаўная царква таксама зыходзіць з таго, што «рэальнасцю становіцца феномен прававой і палітычнай рэгіяналізацыі і глабалізацыі» [7]. У цэлым яна ацэньваецца станоўча: «Развіццё міждзяржаўных адносін спрыяе актывізацыі гандлёвага, вытворчага, ваеннага, палітычнага і іншага супрацоўніцтва, неабходнасць якога дыктуецца натуральным узмацненнем міжнародных сувязяў і патрэбай у сумесным адказе на глабальныя выклікі сучаснасці» [7].

У той жа час у Рускай праваслаўнай царкве адзначаецца, што «нельга недаацэньваць небяспекі разыходжанняў паміж воляй народаў і рашэннямі міжнародных арганізацый. Гэтыя арганізацыі могуць станавіцца сродкамі несправядлівага дамінавання краін моцных над слабымі, багатых над беднымі, тэхналагічна і інфармацыйна развітых над астатнімі, практыкаваць падвойныя стандарты ў галіне прымянення міжнароднага права ў інтарэсах найбольш уплывовых дзяржаў. Усё гэта падахвочвае Праваслаўную Царкву падыходзіць да працэсу прававой і палітычнай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інтэрнацыяналізацыі з крытычнай асцярожнасцю, заклікаючы тых, хто мае ўладу, як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўні да асаблівай адказнасці» [7].

Прыкладна з тых жа пазіцый глабалізацыя разглядаецца і ў каталіцкай царкве. Падкрэсліваецца, што «глабалізацыя сама па сабе не з’яўляецца ні добрай, ні дрэннай, а залежыць ад таго, як яе чалавек выкарыстоўвае… можна сцвярджаць, што неабходна глабалізацыя ахоўных мер, мінімальных асноўных правоў і справядлівасці» [6, с. 228]. Праблемы, якія нараджаюцца глабалізацыяй, бачаць у тым жа, што і праваслаўная царква: «Аналіз актуальнай сітуацыі паказвае, што акрамя адкрыцця магчымасці, якая з’яўляецца ў эпоху глабальнай эканомікі, узнікае небяспека, звязаная з новымі маштабамі гандлёвых і фінансавых адносін. Сапраўды, няма недахопу ў праяўленні тэндэнцый павелічэння няроўнасці як паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, так і ўнутры індустрыяльных краін. Росту эканамічнага багацця, які стаў магчымым дзякуючы вышэйапісаным працэсам, спадарожнічае рост адноснай беднасці» [6, с. 259].

Аднак каталіцкая царква ўяўляе сабой частку заходняй цывілізацыі, якая і з'яўляецца суб'ектам глабалізацыі, і таму апошнюю яна трактуе як унутраны працэс. Што тычыцца Рускай праваслаўнай царквы, то яна зыходзіць з таго, што Расія і Еўропа належаць да розных цывілізацый, таму асноўны адмоўны вынік культурнай глабалізацыі бачыцца ў разбурэнні прынцыпаў традыцыйнай маралі. Таму ў Рускай праваслаўнай царкве падкрэсліваецца неабходнасць супрацьстаяння нормам чужой культуры: «Духоўнай і культурнай экспансіі, якая вядзе да татальнай уніфікацыі, неабходна супрацьпаставіць сумесныя намаганні Царквы, дзяржаўных структур, грамадзянскай супольнасці і міжнародных арганізацыяў дзеля сцвярджэння ў свеце сапраўды раўнапраўнага ўзаемакарыснага культурнага і інфармацыйнага абмену, злучанага з абаронай самабытнасці нацый і іншых чалавечых супольнасцяў» [7].

У каталіцкай жа царкве акцэнт перш за ўсё робіцца на выкарыстанні механізму глабалізацыі для захавання і далейшага распаўсюджання прынцыпу сацыяльнай справядлівасці: «Клопат пра агульнае дабро патрабуе выкарыстання новых магчымасцяў для новага падзелу багаццяў паміж рознымі рэгіёнамі планеты на карысць тых рэгіёнаў, якія знаходзяцца ў самых нявыгадных умовах і да гэтага часу заставаліся па-за ці на ўзбочыне сацыяльнага і эканамічнага развіцця. Значыць, задачай з’яўляецца тое, каб забяспечыць глабалізацыю ў клімаце салідарнасці, глабалізацыю без маргіналізацыі» [6, с. 259–260].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Трэба адзначыць, што ў Рускай праваслаўнай царкве адным з накірункаў супрацоўніцтва з каталіцтвам лічыцца абарона традыцыйных маральных каштоўнасцей. Каласальнае значэнне для наладжвання дыялогу паміж праваслаўнымі і каталікамі ў Беларусі мае падзея, якае адбылася за тысячы кіламетраў адсюль. Гэта сустрэча ў Гаване папы Францыска і патрыярха Кірыла 12 лютага 2016 г. Яна таксама з'яўляецца паказчыкам таго, што рэлігійная сфера ў Беларусі фарміруецца ва ўмовах глабалізацыі.

У заключэнне скажам, што з пункту погляду працэсаў глабалізацыі сучасная Беларусь знаходзіцца паміж Еўропай у яе шырокім сэнсе і Расіяй. У рэлігійным плане гэта праяўляецца ва ўзаемадзеянні двух уплываў: праваслаўнага з усходу і каталіцка-пратэстанцкага з захаду. У выніку ў Беларусі паступова складваецца свая спецыфічная рэлігійная сітуацыя.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Языковіч, В. Р. Глабалізацыя / В. Р. Языковіч // Культура Беларусі: энцыклапедыя. Т. 3. Г-З / рэдкал.: У. Т. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 48 с.
2. Тойнби, А. Постижение истории / А. Тойнби. – М.: Прогресс, 1991. – 736 с.
3. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі). – Мінск: «Беларусь», 2004. – 95 с.
4. Святейший Патриарх Кирилл: Русский мир – особая цивилизация, которую необходимо сберечь». – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: //http:www.patriarchia.ru/db/text/3730705.html. – Дата доступу: 18. 11. 2017.
5. Митрополит Смоленский и Калининградский Кирилл Обстоятельства нового времени. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ng.ru/specfile/2000-12-15/14_obstoyatelstva.html. – Дата доступу: 18. 11. 2017
6. Кампендый сацыяльнага вучэння Касцёла. – Мінск : Про Хрысто, 2011. – 608 с.
7. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви // Официальный сайт Московского Патриархата [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу: http://www. patriarchia.ru /db/text/141422.html – Дата доступу: 18. 11. 2017.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ